Лидия Возисова

## РЭЧКА ВУЦЬ

Мяне люляла рэчка Вуць,
Гукала плыць удалячынь.
Мне б час той колішні вярнуць,
Паплакаць на яго плячы.

Памерацць хвалі басанож.
Прысесць на беразе ў палын,
Паспавядацца, ды ўсё ж
Не супыніць рачулкі плынь…

Ды лепш не думаць пра гады,
Якія адплылі ў нябыт.
Іх рэчка чысцінёй вады
Абмыла, як калісьці плыт...

Той успамін даў зазірнуць
У запаветны мой куток,
Уецца разам з рэчкай Вуць
Адзіны з сэрцайкам выток.

## СВОЙ ДОМ

Свой дом, дзе нарадзіла маці:
Цяпло вачэй і яе рук,
Калыскі скрып і печ у хаце.
Дзе першы крок твой, першы гук.

Рушнік, дзе пеўнікам узоры,
Дзе пугай ляскае пастух...
Тут сэрца грэюць нават зоры,
Касцёр Купалля – не патух.

Калі свой дом – сваю планету,
Як слова роднае збярог,
Тады ты – гаспадар Сусвету
І творца сам сабе, як Бог!

# СЛОВА

Здаўна лічылі: Бог – у слове!
Ягоны Дух стаў на мяжы,
Даў накірунак роднай мове
Ля бездані, сярод імжы.

Па слову сябра разумеем,
Нібы каханне праз пагляд.
Ад плёткі – здзіўлена нямеем,
Бяжым насустрач ці назад.

Любоў у сэрцы памірае
Ад здрады і нядобрых слоў,
Жыццё праз словы нас карае,
Калі не чуем Бога зноў.

Праз словы – аб'ядналі душы,
Знявагай раз'ядналі іх.
Будуем словам, словам рушым...
Ды лепш стрымаць зласлівы міг!

І злоўжываем словам Боскім -
Нячыстай сілаю клянём...
Суд адгукнецца адгалоскам,
І не аб’едзеш нат канём!